ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

№ 8 (247) | Субота, 12 сакавіка 1977 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*Слова да абітурыентаў*

## ВЫШЭЙШУЮ АДУКАЦЫЮ — ЗАВОЧНА

Савецкая краіна, якая ажыццяўляе грандыёзную задачу камуністычнага будаўніцтва, з кожным годам мае ўсё большую патрэбу ў кадрах высокай кваліфікацыі. Іх падрыхтоўка вядзецца па розных формах навучання. Завочная форма — адна з найбольш распаўсюджаных і апраўдаўшых сябе. Сведчаннем гэтага можа быць і наш універсітэт. Цяпер на яго завочным факультэце навучаецца 2717 чалавек — 38 працэнтаў ад усяго кантынгенту студэнтаў ГДУ. Многія з іх, спалучаючы багаты практычны вопыт і набываемыя тэарэтычныя веды, сталі ўжо выдатнымі спецыялістамі.

Ва ўніверсітэце і на яго завочным факультэце прымаюцца ўсе захады для таго, каб дыплом завочніка быў паўнацэнным у самым шырокім сэнсе слова. Для падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці прыцягваюцца найбольш кваліфікаваныя выкладчыкі. Сярод іх — 8 дактароў навук, прафесараў і 73 кандыдаты навук, дацэнты.

Пытанні падрыхтоўкі спецыялістаў па завочнай форме навучання рэгулярна заслухоўваюцца на пасяджэннях Вучонага савета ўніверсітэта, парткома, саветах факультэтаў, на кафедрах.

Вучэбна-выхаваўчая работа з завочнікамі праводзіцца па плану, які распрацоўваецца на кожны семестр і прадугледжвае павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, выхаванне ў студэнтаў глыбокай камуністычнай перакананасці, савецкага патрыятызму, высокай культуры.

За апошні час дэканатам завочнага факультэта сумесна з кафедрамі многае зроблена па ўдасканальванню вучэбных планаў, больш рацыянальнай разбіўцы вывучаемых дысцыплін паміж экзаменацыйнымі сесіямі. Рэгулярна два разы ў месяц праводзяцца «Дні завочніка», у якія можна ліквідаваць акадэмічную запазычанасць, атрымаць кансультацыю, датэрмінова здаць некаторыя залікі і экзамены. А ў верасні і лютым для «Дзён завочніка» адводзіцца па тры суботы. Яны разлічаны ў асноўным для тых, у каго засталася запазычанасць ад зімовай або летняй вучэбна-экзаменацыйных сесій.

Кожны студэнт-завочнік мае ў сябе рабочы вучэбны план на ўвесь навучальны год. У мэтах паляпшэння якасці рэцэнзавання кантрольных і курсавых работ дэканат і кафедры практыкуюць іх паўторнае рэцэнзаванне.

Важнай формай выхаваўчай работы сталі агульныя сходы студэнтаў-завочнікаў, якія праводзяцца ў час сесій. На сходах даецца аналіз паспяховасці, ставяцца канкрэтныя задачы, што выцякаюць з асаблівасцей прадстаячай сесіі, разглядаюцца вынікі работы ў міжсесійны перыяд.

У падрыхтоўцы спецыялістаў вялікае значэнне надаецца практыкам. Асабліва эфектыўна яны праходзяць на біялагічным аддзяленні. Матэрыялы, сабраныя ў экспедыцыях, пасля адпаведнай апрацоўкі выкарыстоўваюцца для курсавых і дыпломных работ.

Добрыя базы для праходжэння вучэбных і вытворчых практык маюць таксама студэнты аддзяленняў эканомікі працы і арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

Ацэньваючы здабыткі, дасягнутыя ў справе падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі па завочнай форме навучання, мы не закрываем вочы і на існуючыя недахопы. На жаль, яны яшчэ ёсць. Для іх ухілення, удасканальвання ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу на завочным факультэце прымаюцца агульныя намаганні рэктарата, дэканата, кафедр, грамадскіх арганізацый універсітэта.

Цяпер мы заклапочаны аб якасным правядзенні набору студэнтаў на новы 1977/78 навучальны год. Планам прадугледжваецца прыняць на першы курс па сямі спецыяльнасцях — эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі, руская мова і літаратура, беларуская і руская мовы і літаратуры, гісторыя, біялогія, фізічнае выхаванне — 425 чалавек. Неабходна адзначыць, што на спецыяльнасці па АМАЭІ, біялогіі і фізічнаму выхаванню, як і ў папярэднія гады, будуць прымацца асобы, якія працуюць ужо па адпаведнаму або блізкаму да яго профілю.

Матэрыялы, якія змешчаны на другой і трэцяй паласах сённяшняга нумара шматтыражнай газеты «Гомельскі ўніверсітэт», пазнаёмяць чытачоў з аддзяленнямі завочнага факультэта. Мы будзем вельмі задаволены, калі з'явіцца шмат жадаючых набываць вышэйшую адукацыю без адрыву ад вытворчасці. Кожны, хто мае патрэбную падрыхтоўку, атрымае такую магчымасць у ГДУ.

Калі ласка, на наш завочны факультэт!

**Т. ТРАЦЭЎСКАЯ,**
**дэкан завочнага факультэта, дацэнт.**

### Дні беларускай літаратуры на Гомельшчыне

## БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ — ГОСЦІ ЎНІВЕРСІТЭТА

Актавая зала ГДУ перапоўнена. Тут сабраліся не толькі студэнты і выкладчыкі ўніверсітэта, але і многія аматары беларускай літаратуры горада. Яны прыйшлі на сустрэчу з вядомымі беларускімі празаікамі і паэтамі. Пракаціліся бурныя апладысменты, калі ў прэзідыуме з'явіліся першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Іван Шамякін, крытык дацэнт БДУ імя У. І. Леніна Дзмітрый Бугаёў, майстры мастацкага слова Анатоль Грачанікаў, Пятрусь Макаль, Вячаслаў Адамчык, Васіль Зуёнак, Барыс Сачанка, Міхась Сталяроў, Аляксандр Капусцін, гомельскія літаратары Леанід Гаўрылкін, Іван Сяркоў, член саюза пісьменнікаў БССР, загадчык кафедры беларускай літаратуры, прафесар Мікола Грынчык, прадстаўнікі рэктарата, парткома, грамадскіх арганізацый універсітэта.

Сустрэчу з дарагімі гасцямі адкрывае і горача віншуе іх ад імя шматтысячнага ўніверсітэцкага калектыву рэктар член-карэспандэнт АН БССР Б. В. Бокуць. Ён выказвае вялікае задавальненне ад таго, што такія сустрэчы сталі ўжо традыцыйнымі і прыносяць вялікую карысць.

Выступае кіраўнік пісьменніцкай дэлегацыі Іван Шамякін. Ён гаворыць аб тым, што пісьменнікі Беларусі, як і ўсе працоўныя, рыхтуюць дастойную сустрэчу юбілею Вялікага Кастрычніка. Гэтай знамянальнай даце прысвячаюцца і «Дні беларускай літаратуры». Тое, што іх правядзенне пачалося з Гомельшчыны — не выпадковасць. На зямлі беларускага Палесся нарадзілася шмат выдатных літаратараў. Адным з іх з'яўляецца Іван Паўлавіч Мележ, на радзіме якога пісьменніцкая дэлегацыя пабывала напярэдадні. Іван Шамякін расказаў аб тых глыбокіх уражаннях, якія засталіся ад наведвання в. Глінішчы Хойніцкага раёна, дзе пачынаўся творчы шлях народнага пісьменніка Івана Паўлавіча Мележа.

Затым Іван Шамякін расказаў аб развіцці сучаснай беларускай літаратуры, аб яе пачэсных задачах на новым этапе камуністычнага будаўніцтва, падзяліўся сваімі творчымі задумамі.

З вялікай увагай ўдзельнікі літаратурнай сустрэчы выслухалі выступленне вядомага беларускага крытыка, даследчыка творчасці Івана Мележа Дзмітрыя Бугаёва. Ён расказаў пра тое, над чым працаваў пісьменнік у апошнія гады свайго жыцця, чаго не паспеў ажыццявіць.

Усе прысутныя ў зале цёпла ўспрынялі выступленні нашых землякоў паэта Анатоля Грачанікава, пісьменніка, намесніка рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва» Аляксандра Капусціна, а таксама Вячаслава Адамчыка, Петруся Макаля, Васіля Зуёнка, Барыса Сачанкі, старшыні Гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР Леаніда Гаўрылкіна.

Рэктар універсітэта Б. В. Бокуць горача дзякаваў гасцей за гэту памятную сустрэчу, якая вылілася ў сапраўднае свята беларускай літаратуры. Ён уручыў Івану Шамякіну своеасаблівы адрас з адлюстраваннем галоўнага корпуса ГДУ і словамі ўдзячнасці Саюзу пісьменнікаў БССР, члены якога аналагічным правядзеннем літаратурных сустрэч уносяць дастойны ўклад у ідэйна-эстэтычнае выхаванне студэнцкай моладзі.

У літаратурнай сустрэчы прынялі ўдзел загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў абкома КПБ Ф. Р. Забродскі і інструктар аддзела прапаганды і агітацыі АК КПБ А. Р. Майсеенка.

Многія ўдзельнікі літаратурнай сустрэчы ў гэты дзень набылі творы гасцей-пісьменнікаў і ўзялі іх аўтографы.

У наступным нумары нашай газеты на літаратурнай старонцы мы прадставім слова нашым гасцям.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

## ВЫЗНАЧАНЫ ЛЕПШЫЯ АКАДЭМІЧНЫЯ ГРУПЫ

**Камітэт камсамола ўніверсітэта сумесна з прафкомам падвялі вынікі сацыялістычнага спаборніцтва на лепшую акадэмічную групу ГДУ. Згодна палажэнню аб аглядзе-конкурсе на лепшую акадэмічную групу, вынікі падводзіліся па наступных асноўных паказчыках: вучэбная, навуковая, грамадская работа, СБА, спорт, культура быту.**

**Пераможцай сацспаборніцтва, прысвечанага 60-годдзю Вялікага Кастрычніка, па выніках 1 семестра 1976—77 навучальнага года выйшла група Б-31 біялагічнага факультэта. У яе самыя высокія паказчыкі па вучэбнай, навуковай і грамадскай рабоце. З 25 студэнтаў групы — 6 выдатнікаў, астатнія займаюцца толькі на «добра». Многія студэнты займаюцца навукова-даследчай работай.**

**На другім месцы — група Р-41 гісторыка-філалагічнага факультэта. Тут таксама на высокім узроўні навуковая і грамадская работа студэнтаў.**

**Трэцяе месца ў сацыялістычным спаборніцтве заваявала група Т-41 эканамічнага факультэта.**

**Пераможцы агляду-конкурсу ГДУ ўзнагароджаны пераходнымі вымпеламі і граматамі камітэта камсамола.**

ПРЫСВЕЧАНЫЯ МІЖНАРОДНАМУ ЖАНОЧАМУ ДНЮ

## Урачысты вечар

**6 сакавіка вечарам актавую залу ўніверсітэта запоўнілі супрацоўнікі і студэнты ГДУ. Яны сабраліся на ўрачыстаць, прысвечаную Міжнароднаму жаночаму дню.**

**З дакладам на вечары выступіла старшыня мясцкома, дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі А. В. Саннікава.**

**Удзельнікі мастацкай самадзейнасці выступілі на вечары з вялікім святочным канцэртам.**

## «АГЕНЬЧЫК» У ІНТЭРНАЦЕ

У інтэрнаце № 2 стала добрай традыцыяй наладжваць камсамольскія «Агеньчыкі», прысвечаныя знамянальным датам. Яе пачынальнікамі сталі студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта, якія жывуць на 5-м паверсе. Жывуць тут рабяты дружныя, вясёлыя і знаходлівыя.

У прыгожа ўбранай зале яны сабраліся на гэты раз, каб адзначыць свята вясны і шчасця — 8 Сакавіка. Увесь вечар гучала музыка, кружыліся ў вальсе пары, чуліся жарты, смех, гучалі песні. З вялікай цікавасцю праводзіліся разнастайныя конкурсы.

Удзельнікі святочнага «Агеньчыка», яго ганаровыя госці падзяліліся сваімі ўражаннямі ад праведзенага мерапрыемства.

**Марына Васільеўна ФЕДАРАВА,** прафесар кафедры рускай мовы:

— Гэты «Агеньчык» нагадаў мне мае студэнцкія гады. Я яшчэ мала, вельмі мала ведаю гэтых студэнтаў. Знаёміцца з імі больш блізка мне прыйшлося на «Агеньчыку», на які яны мяне запрасілі. І гэтае знаёмства было вельмі прыемным.

**Фелікс Феліксавіч ГАНЧЭЛЬ,** дацэнт, старшыня журы:

— Я ўяўляў гэты «Агеньчык» зусім інакш. Спачатку быў нават не прыхільнікам такіх мерапрыемстваў. Але цяпер пераканаўся, што студэнцкая моладзь умее разумна адпачываць. Трэба толькі, каб заўсёды быў чалавек, які б змог павесці за сабой, згуртаваць, накіраваць усе яе таленты ў правільным напрамку. На маю думку, на такія мерапрыемствы трэба запрашаць прадстаўнікоў студсаветаў іншых інтэрнатаў, каб яны вучыліся, як трэба карысна праводзіць свой вольны час, а не закрывацца ў пакоях і дрыжаць ад слова «праверка».

**Віктар ПАКЛОНСКІ,** студэнт геалагічнага факультэта:

— Я прысутнічаў ужо на другім «Агеньчыку». Але апошні для мяне самы памятны. Сам я вельмі люблю песні, гітару... А калі чалавек любіць песню і музыку, ён пройдзе праз усе перашкоды. І галоўнае — пры ўсіх выпрабаваннях заставацца сапраўдным чалавекам.

**Г. КАРНАЧ,**
**член студсавета інтэрната № 2.**

НАСУСТРАЧ СЛАЎНАМУ ЮБІЛЕЮ

# ВЯЛІКІ КАСТРЫЧНІК НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

Актыўны ўдзел у барацьбе супраць карнілаўшчыны прыняў Рэчыцкі Савет, у якім ужо ў жніўні 1917 г. асноўнае месца занялі бальшавікі. 257 запасны полк, які дыслакаваўся ў Рэчыцы і цалкам падтрымліваў бальшавікоў, быў прыведзены ў баявую гатоўнасць, узяў пад кантроль чыгуначную станцыю і не прапускаў з фронту карнілаўскія часці. Рабочыя Рэчыцы сфарміравалі «сацыялістычную роту» з 150 чалавек, узброілі яе і пад камандаваннем бальшавіка Я. Міцкевіча накіравалі ў Жлобін для барацьбы супраць карнілаўцаў.

Спецыяльная калегія з 5 чалавек для арганізацыі барацьбы з карнілаўскім мяцежам была створана на пасяджэнні Рагачоўскага Савета.

На станцыі Калінкавічы пад кіраўніцтвам дэпутата Гомельскага Савета сакратара Палескага камітэта РСДРП(б) Г. М. Прыварошкага 30 жніўня быў праведзены мітынг салдат, накіроўваемых з фронту на дапамогу Карнілаву. На гэтым мітынгу салдаты аднадушна асудзілі карнілаўскую авантюру і выказалі гатоўнасць ўсімі сіламі змагацца супраць яе.

У перыяд барацьбы з карнілаўшчынай у Гомелі па заклiку бальшавікоў успыхнула паўстанне 15 тысяч салдат размеркавальнага пункта, якія адмовіліся ехаць на фронт для працягу рабаўніцкай вайны. На падаўленне паўстання быў накіраваны 18 Паўночны полк 5-й Каўказскай дывізіі. Аднак пад кіраўніцтвам палкавога камітэта, узначальваемага С. М. Будзённым, полк падтрымаў паўстаўшых салдат. У некаторай ступені гэта таксама садзейнічала разгрому карнілаўскай змовы.

У барацьбе супраць карнілаўшчыны актыўны ўдзел прынялі сяляне Гомельшчыны. У радзе вёсак Гомельскага, Рэчыцкага і Рагачоўскага паветаў у дні карнілаўшчыны па ініцыятыве бальшавікоў былі сфарміраваны баявыя атрады. Асабліва паспяхова дзейнічаў Насовіцкі ўзброены атрад сялян, які ўстанавіў кантроль за перамяшчэннем вайсковых эшалонаў на бліжэйшых чыгуначных станцыях. Буйны ўзброены атрад быў арганізаваны таксама ў Кармянскай воласці пад камандаваннем бальшавіка Антоненкі.

Барацьба Палескага камітэта супраць карнілаўскай змовы значна павысіла яго аўтарытэт. У Гомелі, Рэчыцы, Мазыры, як і ў іншых гарадах краіны, пачалася ўзмоцненая бальшавізацыя Саветаў. Палескі камітэт зноў поўнасцю легалізаваў сваю дзейнасць. Зноў на парадак дня стаў лозунг «Уся ўлада Саветам!». Аднак гэта не азначала, што з парадку дня знімалася пытанне аб падрыхтоўцы ўзброенага паўстання. Партыя бальшавікоў, кіруючыся ўказаннямі У. І. Леніна, праводзіла вялікую работу па ідэалагічнай і практычнай падрыхтоўцы мас да ўзброенага паўстання, з'ядноўваючы іх вакол бальшавіцкага сцяга.

1 верасня 1917 года адбылося пасяджэнне Гомельскага Савета, на якім абмяркоўвалі пытанне аб бягучым моманце. Пад уплывам бальшавікоў Савет адхіліў меншавіцка-эсэраўскую рэзалюцыю, якая заклікала да згоды з контррэвалюцыйнымі буржуазнымі партыямі. 9 верасня было склікана новае пасяджэнне Савета. І на гэты раз згодніцкую рэзалюцыю адхілілі. Было прынята рашэнне, прапанаванае бальшавікамі. Старшыня Савета меншавік Сяўрук быў вымушаны падаць у адстаўку. У перавыбраным выканаўчым Камітэце Савета бальшавікі занялі шэсць месц з пятнаццаці і разам з левымі эсэрамі, атрымаўшымі тры месцы, валодалі абсалютнай большасцю галасоў. Намеснікам старшыні выканкома быў выбраны бальшавік Г. М. Ляплеўскі.

15 верасня 1917 г. у Мінску адбылася 1-я канферэнцыя РСДРП(б) Паўночна-Заходняй вобласці. На ёй была аформлена адзіная бальшавіцкая арганізацыя Беларусі, у састаў якой увайшоў і Палескі камітэт РСДРП(б). Ад бальшавікоў Гомельшчыны ў састаў Паўночна-Заходняга абласнога камітэта выбралі М. М. Хатаевіча. Старшынёй камітэта быў выбраны А. Ф. Мяснікоў. Баявым органам абласнога камітэта стала газета «Молат», першы нумар якой выйшаў у дзень адкрыцця канферэнцыі — 15 верасня.

Аб'яднанне ўсіх бальшавіцкіх арганізацый Беларусі і Заходняга фронту, стварэнне адзінага кіруючага органа — Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) — адыграла вялікую ролю ў справе падрыхтоўкі працоўных Беларусі да рашаючых бітваў за ўладу Саветаў.

З мэтай далейшай актывізацыі барацьбы за перадачу ўсёй улады ў рукі Саветаў 5 кастрычніка 1917 г. у Мінску адкрылася 2-я Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б). Кіруючыся ўказаннямі ЦК бальшавікоў, канферэнцыя заклікала ўсе партыйныя арганізацыі Беларусі да забеспячэння на месцах падрыхтоўкі па скліканню Ўсерасійскага з'езда Саветаў. Канферэнцыя выпрацавала таксама практычныя мерапрыемствы, якія забяспечвалі скліканне II з'езда Саветаў, і выказалася за ўзмацненне друкаванай і вуснай агітацыі за перавыбары Саветаў і камітэтаў.

Кіруючыся ўказаннямі Цэнтральнага Камітэта партыі і рашэннямі 2-й Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РСДРП(б), бальшавікі Гомельшчыны шырока разгарнулі работу па мабілізацыі працоўных на барацьбу за Савецкую ўладу і дабіваліся прыняцця Саветамі рэзалюцый аб перадачы ўсёй улады ў краіне ў рукі Саветаў. Так, бальшавікі Мазыра дабіліся прыняцця на V сялянскім з'ездзе Мазырскага павета, які адбыўся 6—7 кастрычніка ў Мазыры, бальшавіцкай рэзалюцыі, у якой гаварылася:

«1. Уся ўлада ў краіне павінна належаць Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў». Урад павінен быць састаўлен толькі з прадстаўнікоў рэвалюцыйных рабочых, салдат і сялян і павінен быць адказным перад Саветамі. Капіталістам і памешчыкам не павінна быць месца ў сапраўды рэвалюцыйным урадзе.

2. Новая ўлада ў краіне павінна неадкладна прапанаваць усім ваюючым народам справядлівы мір.

3. Усе памешчыцкія, дзяржаўныя, царкоўныя землі з ўсімі ўгоддзямі на іх павінны быць неадкладна перададзены без усялякага выкупу ў распараджэнне сялянскіх камітэтаў. Гэта падарве сілу памешчыкаў.

4. У мэтах барацьбы з гаспадарчай разрухай неабходна ўстанавіць кантроль рабочых і сялян над вытворчасцю і абаротам тавараў... Гэта павялічыць прадукцыйнасць фабрык і заводаў і ўстановіць правільны абмен тавараў паміж горадам і вёскай...»

**Э. ЭНЦІН,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі КПСС.**

(Працяг. Пачатак у №№ 5, 6, 7).

ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

# НА ВУЧОБУ

Авалодаць нормамі сучасных рускай і беларускай літаратурных моў, развіць здольнасць да самастойнага даследавання моўных з'яў, выпрацаваць трывалыя навыкі пісьма, адчуць прыгажосць і мнаграннасць роднага слова асабліва неабходна людзям, якім даводзіцца карыстацца словам як прафесійным сродкам, — настаўнікам, пісьменнікам, журналістам, лектарам. Таму ў сістэме падрыхтоўкі філалагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі, настаўнікаў-славеснікаў важнае месца адводзіцца завочнаму навучанню. Сярод спецыяльнасцей, па якіх вядзецца падрыхтоўка на завочным факультэце, ёсць і дзве філалагічныя — руская мова і літаратура і беларуская і руская мовы і літаратуры.

Сёння на факультэце чатыры літаратуразнаўчыя і лінгвістычныя кафедры, якія аб'ядноўваюць буйныя навуковыя сілы рэспублікі ў галіне мовазнаўства і літаратуразнаўства. На факультэцкіх кафедрах навукова-выкладчыцкую работу вядуць дактары філалагічных навук, сапраўдныя настаўнікі моладзі — праф. Ул. В. Анічэнка, праф. М. М. Грынчык, праф. М. В. Фёдарава, працы якіх вядомы далёка за межамі рэспублікі.

Заслужанай любоўю студэнтаў, вялікім аўтарытэтам карыстаюцца дацэнты і старшыя выкладчыкі А. К. Няронская, М. А. Маляўка, В. І. Мядзведзева, З. А. Рудакоўская, В. І. Смыкоўская і інш. Сярод тых, хто сёння перадае свае веды студэнтам, раскрывае багацце і разнастайнасць уласцівых мове сродкаў выказвання думак і пачуццяў, выпрацоўваючы ўдумлівыя, беражлівыя адносіны да слова, дапамагае даведацца пра духоўныя здабыткі народаў, садзейнічае выхаванню ўсебакова развітай, гарманічнай асобы, былыя выхаванцы факультэта член-карэспандэнт АПН СССР, доктар педагагічных навук,

## ФІЛАЛАГІЧНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

праф. І. Ф. Харламаў, кандыдаты навук — Р. К. Літвінаў, А. А. Парукаў, В. У. Ярац, выкладчыкі — В. Е. Громава, Л. І. Злобін, Р. М. Казлова, М. М. Корсакава і інш.

На філалагічным факультэце вучыліся першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. П. Шамякін, паэты і празаікі — Леанід Гаўрылаў, Мікола Гроднеў, Міхась Даніленка, Мікола Сурначоў, Паўлюк Прануза і інш.

Вучэбны працэс у сістэме завочнай падрыхтоўкі істотна адрозніваецца ад дзённага. Ён падзяляецца на вучэбна-экзаменацыйныя сесіі і перыяд міжсесійнай самастойнай работы студэнтаў-завочнікаў. Самастойная для іх работа мае першаступеннае значэнне.

У адпаведнасці з вучэбным планам у міжсесійны перыяд завочнік выконвае кантрольныя, курсавыя работы, якія даюць магчымасць у значнай ступені праверыць самастойную работу студэнта ў перыяд паміж сесіямі, высветліць як ён засвоіў праграмны матэрыял, выявіць недахопы і дапамагчы ліквідаваць іх. Выкананне студэнтам кантрольных, курсавых работ спрыяе развіццю ўмення прымяняць атрыманыя тэарэтычныя веды на практыцы і тым самым дапамагае глыбей засвоіць вучэбны матэрыял. Кафедры даюць метадычныя парады, рэкамендацыі, як лепш арганізаваць самастойнае вывучэнне матэрыялу ў перыяд паміж вучэбна-экзаменацыйнымі сесіямі, як выконваць кантрольныя, курсавыя і дыпломныя работы, як рыхтавацца да экзаменаў і залікаў.

Студэнты-завочнікі ўдзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце кафедр, выступаюць з дакладамі на навуковых канферэнцыях. Лепшыя студэнцкія работы штогод прадстаўляюцца на конкурс навуковых работ вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Студэнты-завочнікі маюць права карыстацца ўніверсітэцкімі бібліятэкамі і чытальнымі заламі. Спецыяльна для іх вучонымі факультэта створаны шэраг вучэбных дапаможнікаў і метадычных распрацовак па асобных дысцыплінах.

Выпускнікі факультэта, атрымліваюць усё неабходнае для людзей, здольных паспяхова вырашаць задачы, пастаўленыя перад школай Камуністычнай партыяй і Савецкім урадам.

**В. ГОРЛЕНКА,**
**нам. дэкана па завочнаму факультэту, в. а. дацэнта кафедры беларускай мовы.**

## АДДЗЯЛЕННЕ ЭКАНОМІКІ ПРАЦЫ

У цяперашні час да эканамістаў па працы прад'яўляюцца вялікія патрабаванні: веданне метадаў аналізу; уменне вызначаць аб'ём зыходнай інфармацыі; навыкі пабудовы аналітычных табліц і веданне мнагафактарнага аналізу; веданне асноўных метадаў механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі; уменне прадугледжваць вынікі змены працоўных працэсаў. Акрамя гэтага эканамісты па працы павінны выконваць на высокім узроўні функцыянальныя абавязкі — праектаваць працоўныя працэсы з адпаведным эканамічным абгрунтаваннем, распрацоўваць навукова абгрунтаваныя нарматывы, праектаваць рацыянальныя рэжымы працы і адпачынку, распрацоўваць паказчыкі матэрыяльнага і маральнага заахвочвання, планаваць працоўныя паказчыкі. Эканаміст па працы павінен валодаць і арганізацыйнымі здольнасцямі (навыкамі адносін з людзьмі, уменнем арганізоўваць самафотаздымак рабочага дня і г. д.).

Асаблівасцю падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці з'яўляецца тое, што на завочны факультэт студэнты прыходзяць з пэўнымі ведамі і навыкамі па спецыяльнасці. Аднак тэарэтычная падрыхтоўка ў іх яшчэ недастатковая. Напрыклад, тыя, хто працуе нарміроўшчыкамі, слаба ведаюць сучасныя метады нарміравання і вывучэння працоўных працэсаў. Задача выкладчыкаў — дабіцца сувязі тэорыі і практыкі, на лекцыях і практычных занятках прадумаць, што даць студэнтам-завочнікам. Таму да правядзення заняткаў на завочным факультэце прыцягваюцца найбольш вопытныя выкладчыкі.

У працэсе навучання кафедра надае вялікае значэнне чытанню спецкурсаў: «Сацыялогія працы», «Аналіз працоўных паказчыкаў», «Прымяненне матэматычных метадаў у эканоміцы» і інш.

Важнейшым фактарам у падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі з'яўляецца матэрыяльная база. У нас працуе спецыяльна абсталяваная лабараторыя аргтэхнікі і тэхнарміравання, кабінет эканомікі працы і тры лабараторыі, аснашчаныя вылічальнай тэхнікай. Пры чытанні лекцый шырока выкарыстоўваюцца альбомы наглядных дапаможнікаў, графікі, дыяграмы, схемы і табліцы.

Важнае месца ў арганізацыі вучэбнага працэсу займае метадычная работа. Так, напрыклад, выкладчыкамі кафедры падрыхтаваны і выдадзены два дапаможнікі: «Прымяненне эканоміка-матэматычных метадаў у аналізе і прагназіраванне вытворчасці працы», «Метадычныя ўказанні да практычных заняткаў па тэхнічнаму нарміраванню працы» і інш.

**У. АРЭШЧАНКА,**
**загадчык кафедры эканомікі працы, дацэнт.**

## АДДЗЯЛЕННЕ АМАЭІ

Арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — адна з важнейшых спецыяльнасцей, па якіх ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў на завочным факультэце ўніверсітэта. Бурнае развіццё электронна-вылічальнай тэхнікі, яе выкарыстанне ў самых розных сферах чалавечай дзейнасці, у тым ліку і ў эканоміцы, ствараюць дэфіцыт у спецыялістах, якія могуць працаваць на ЭВМ, ставіць і вырашаць на іх канкрэтныя задачы, праектаваць і ўкараняць аўтаматызаваныя сістэмы кіравання.

На завочным факультэце адбыўся пакуль што толькі адзін выпуск спецыялістаў па АМАЭІ. Усе выпускнікі паспяхова працуюць на прадпрыемствах, у арганізацыях і ведамствах Беларусі і іншых саюзных рэспублік. Дыяпазон выконваемых імі работ вельмі шырокі: ад пастаноўшчыкаў задач, аператараў і праграмістаў да начальнікаў аддзелаў аўтаматызаванай сістэмы кіравання вытворчасцю, статупраўленняў і кіраўнікоў падраздзяленняў у навукова-даследчых арганізацыях. І гэта не выпадкова, таму што прынятая сістэма падрыхтоўкі, вучэбныя планы і праграмы чытаемых курсаў садзейнічаюць фарміраванню спецыялістаў шырокага профілю. Акрамя таго, у завочнай формы навучання ёсць адна перавага, якая дазваляе рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў: за ўвесь час навучання ва ўніверсітэце студэнты-завочнікі не толькі вывучаюць тэорыю, але і пастаянна ўдасканальваюцца на прадпрыемствах на практыцы, таму што ўсе яны працуюць па той жа або блізкай да вывучаемай ва ўніверсітэце спецыяльнасці.

Зараз прыступаюць да дыпломнага праектавання студэнты-завочнікі другога выпуску — выпуску юбілейнага года. Зусім хутка яны будуць абараняць перад Дзяржаўнай камісіяй свае дыпломныя работы, многія з якіх, без сумнення, будуць выкарыстаны для ўдасканальвання працэсаў машыннай апрацоўкі даных на прадпрыемствах, дзе яны працуюць. Пажадаем жа ім паспяховай работы і абароны дыпломаў, поспехаў у працы ўжо ў новай якасці — якасці спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.

**Г. НАРЫШАЎ,**
**в. а. загадчыка кафедры АМАЭІ, кандыдат эканамічных навук.**

*Правяраюць народныя дазорныя*

# КРЫЎДА І РЭАЛЬНАСЦЬ

У верасні мінулага года рэйдавая брыгада народных кантралёраў правярала работу ўніверсітэцкай сталовай. Тады было выяўлена шэраг істотных недахопаў. Аб іх гаварылася ў матэрыяле «Студэнцкую сталовую зрабіць узорнай», змешчаным на старонках нашай шматтыражкі за 25 верасня 1976 г.

Было лагічна на крытычную публікацыю чакаць ад загадчыцы сталовай Ф. Філон канкрэтнага рэагавання. На здзіўленне, яна абмежавалася маўчаннем. Больш таго: стала ў позу пакрыўджанай. Маўляў, універсітэцкая сталовая ўключылася ў рэспубліканскі агляд-конкурс студэнцкіх прадпрыемстваў грамадскага харчавання, а тут ставяць «падножку», мяшаюць заняць першае месца.

Не, вось такім падыходам да справы гонар не заваёўваецца.

Перад намі зноў акт аб праверцы сталовай № 40. На гэты раз у рэйдзе ўдзельнічалі члены групы народнага кантролю АГЧ М. Бібікаў, Н. Палякова, А. Анічэнка, член мясцкома А. Окрут, член партарганізацыі АГЧ В. Анісімава, група студэнтаў эканамічнага факультэта, памочнік санітарнага ўрача па гігіене харчавання гарадской санэпідэмстанцыі К. Моляр. Праверка праводзілася ў прысутнасці загадчыцы сталовай Ф. Філон і загадчыцы вытворчасцю Л. Буравай.

Перш за ўсё была звернута ўвага на асартымент меню. Па-ранейшаму ён застаецца бедным. Вельмі рэдка бываюць стравы і гарнір з бульбы, зусім мала салатаў з гародніны, якія вясной, пры недахопе ў арганізме вітамінаў, асабліва неабходны.

Правяраецца адпаведнасць устаноўленай норме наяўных страў. Па выбару саміх кіруючых работнікаў сталовай на вагі ставіцца порцыя гуляшу. Замест 75 грам у ёй аказалася толькі 65, а ў другой і таго менш — 62. Затым былі ўзважаны тры порцыі смятаны. У іх аказалася 90, 93 і 88 грам. Словам, што ні порцыя — дык менш належнага.

Правяраючыя ўмоўна прыкінулі аб «здабытках» такой недадачы. Калі ўлічыць, што ў студэнцкай сталовай штодзень харчуецца, скажам, тысяча чалавек, то ад аплачваемых імі страў «урываюцца» многія кілаграмы мясных прадуктаў, смятаны і інш.

У час праверкі рэйдавая брыгада апытала некалькіх пастаянных наведвальнікаў сталовай, прозвішчы якіх занесены ў акт. Аб студэнцкай сталовай яны выказаліся так: «Дрэнная якасць стравы. Выбар малы». Мала бульбы. Вараная капуста вельмі кіслая, нельга есці». «Бульбы мала, брудныя шклянкі». «Рыхтуюць сярэдне». «Няма выбару, дрэнная якасць».

Непрыемнае ўражанне ў правяраючых засталося і ад санітарнага стану сталовай. Столь і сцены ў вытворчых цэхах пакрыліся цвіллю, забрудніліся. Уборка тут праводзіцца нялкасна. Дрэнна мыюцца раздзелачныя сталы, панэлі, падлога, вокны, абсталяванне. Пры ўваходзе ў сталовую няма ўрнаў, тут засмечана. У многіх месцах павісла павуцінне.

З грубымі парушэннямі санітарных правіл захоўваюцца асобныя прадукты. Так, мясны салат знаходзіўся ў тары, якая звонку не прамыта. У цэху халодных закусак без патрэбы стаялі скрынкі з пустымі банкамі. Жараная рыба захоўвалася ў пакоі, заваленым пустой тарай.

На раздатачнай халадзільны прылавак для халодных закусак не працуе, пад раздатачнай лініяй засмечана. І такі беспарадак — куды не паглядзіш. Не выпадкова памочнік санурача па гігіене харчавання К. Моляр адзначыла, што сталовай, з больш запушчаным санітарным станам, у нашым горадзе яна ў апошні час не бачыла.

Па выніках праведзенай праверкі мы прывялі дастаткова фактаў, якія абавязваюць зрабіць адпаведныя вывады як загадчыцы сталовай № 40 Ф. Філон, так і трэсту рэстаранаў, сталовых і кафэ.

## ЗАКЛАПОЧАНАСЦЬ КАМСАМОЛЬЦАЎ

Нядаўна адбылося пашыранае пасяджэнне камсамольскага актыву эканамічнага факультэта. З дакладам «Аб выніках здачы зімовай сесіі» выступіў старшыня ВВК факультэта Г. Ліскоў. Асноўную ўвагу дакладчык звярнуў на недахопы. У прыватнасці, ён адзначыў, што зніжэнне ініцыятывы і патрабавальнасці ў рабоце актыву групы адбілася на выніках сесіі. Былі названы адстаючыя па паспяховасці групы факультэта: Т-14, Т-21, Т-22, 0-22, 0-23. Выступілі камсоргі і старасты гэтых груп, якія растлумачылі прычыны такога становішча . На пасяджэнні было вырашана абавязаць актыў груп прыкласці ўсе намаганні, каб павысіць паспяховасць камсамольцаў і добра здаць летнюю экзаменацыйную сесію. Для гэтага неабходна вывучыць вопыт перадавых груп факультэта, у прыватнасці, групы Т-41, якая ў аглядзе-конкурсе на лепшую акадэмічную групу ўніверсітэта заняла 3-е месца. Тут жа, на пасяджэнні актыву, камсоргу групы В. Пякуевай быў уручаны пераходны вымпел «За высокія паказчыкі ў сацыялістычным спаборніцтве».

З дакладам «Задачы камсамольцаў арганізацыі факультэта на бягучы перыяд» выступіў сакратар камсамольскага бюро факультэта А. Сенін. Сярод названых у дакладзе мерапрыемстваў асобна трэба выдзеліць такія, як тыдзень прававых ведаў, факультэцкі агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці, сход выдатнікаў, якія патрабуюць самай сур'ёзнай і старраннай падрыхтоўкі.

На пасяджэнні актыву ўсе з радасцю ўспрынялі паведамленне, што член камсамольскага бюро, старшыня камітэта ДТСААФ факультэта М. Петрушэнка рашэннем Гомельскага абласнога камітэта ДТСААФ узнагароджан нагрудным знакам «За выдатную работу», які тут жа быў яму і ўручаны.

**Т. РУБАН,**
**старшыня прэс-цэнтра факультэта,**
**Л. КУПРЫЯНОВІЧ,**
**староста групы Т-12.**

*З любоўю да прыроды*



ГІМН ВЯСНЕ.

Фотаэцюд **А. Карніенкі.**

**Да тыдня донара**

# ПРАЯВІМ СВАЮ ГУМАННАСЦЬ

У СССР донарства мае важнае дзяржаўнае значэнне. Яно з'яўляецца ганаровым, гуманным і патрыятычным укладам савецкіх людзей у справу аховы здароўя народа.

З кожным годам павялічваецца патрэба лячэбных устаноў у крыві, яе прэпаратах (гамаглабулін, поліглабулін, фібрынаген, фібрыналізін, альбумін, трамбін) і яе кампанентах (плазма, эрытрацытная, лейкацытная і трамбацытная масы). Гэта тлумачыцца хуткім павелічэннем колькасці бальніц, павышэннем кваліфікацыі лячэбнай дапамогі, адкрыццём новых метадаў лячэбнага прымянення крыві ў апаратах штучнага кровазвароту і ў выглядзе прэпаратаў і кампанентаў крыві. Без дастатковай колькасці крыві навейшыя метады лячэння, асабліва аператыўная хірургія, не могуць удасканальвацца. Так, у хірургічных клініках на кожны ложак у год расходуецца больш 2 літраў крыві, у гематалагічных клініках — 5 л., у клініках, дзе праводзяць аперацыі на сэрцы і лёгкіх — 12—15 л. Таму своечасовае забеспячэнне лячэбных устаноў донарскай крывёй — гэта тысячы і тысячы выратаваных жыццяў і пазбаўленых ад хваробы людзей.

Донарская кроў неабходна кожны дзень і кожную гадзіну: для хворага, якому прадстаіць складаная аперацыя, для выратавання чалавека, пацярпеўшага пры аварыі або атручванні, для жанчыны, страціўшай многа крыві пры родах, а таксама для лячэння шокаў, прамянёвай і апёкавай хвароб, хвароб крыві, многіх дзіцячых захворванняў і г. д.

Праблема донарства надзвычай актуальная. Слова «донар» паходзіць ад лацінскага «донарэ», што азначае «дарачы». І сапраўды, донар — гэта выдатны чалавек, з добрым і шчырым сэрцам, які дарue частку сваёй крыві для выратавання хворага або трапіўшага ў бяду чалавека.

З кожным днём растуць рады бясплатных донараў, людзей, якімі кіруюць пачуцці патрыятызму, высокая свядомасць, гуманнасць і таварыскасць, аб'яднаных адной цудоўнай якасцю — любоўю да чалавека, жаданнем дапамагчы яму ў цяжкую мінуту. У бліжэйшыя гады плануецца перайсці на нарыхтоўку крыві ад бясплатных донараў на 90—95 працэнтаў.

Здаровы чалавек добра пераносіць невялікія страты крыві. У донара, які бясплатна аддае кроў, бяруць яе 1—2 разы ў год па 200 мл за адзін раз, што складае прыкладна 1/25 частку ўсяго аб'ёму. Такая нязначная страта поўнасцю кампенсуецца за лік пераразмеркавання крыві ў арганізме, прыносіць карысць самому донару. Яна заключаецца ў тым, што аднаўляецца «дэпо крыві», абуджаецца задрамаўшая сістэма, хутчэй выпрацоўваецца плазма. У выніку гэтага паляпшаецца абмен рэчываў, павышаецца працаздольнасць. Бясшкоднасць донарства пацвярджаецца вялікім практычным вопытам. Здаровы чалавек без шкоды для здароўя можа адзін раз у два месяцы даць да 500 мл крыві. Устаноўлена, што пры ўзяцці крыві ў колькасці 400 мл аб'ём яе аднаўляецца к канцу першых сутак за лік прытоку вадкасці з тканін у крывяное русла. На працягу 15 дзён кроў поўнасцю аднаўляецца.

З году ў год растуць рады бясплатных донараў і ў нашым універсітэце. У 1976 годзе «Тыдзень донара» прайшоў арганізавана і паспяхова, паказаў высокую свядомасць студэнтаў, пачуццё патрыятычнага, грамадзянскага абавязку. Бясплатна далі кроў 1025 чалавек, г. зн. кожны чацвёрты студэнт стаў донарам. Па 5 і больш разоў давалі кроў студэнты Г. Лосеў, В. Палякоў, В. Чыкуноў, В. Капыткоў, А. Радзінскі, Т. Бакун, Л. Хілінскі, В. Растаргуеў, В. Осіпаў і многія іншыя.

Найбольш актыўныя донары былі ўзнагароджаны граматамі абкома таварыства Чырвонага Крыжа, грашовымі прэміямі, пуцёўкамі ў санаторый-прафілакторый, значком «Донар СССР» II і III ступені.

Аб высакароднасці і высокай свядомасці студэнтаў нашага ўніверсітэта сведчыць і той факт, што студэнты будаўнічага атрада «Белая Русь» у час трэцяга працоўнага семестра бясплатна здалі сваю кроў для выратавання жыцця пацярпеўшых.

З 21 па 29 сакавіка ва ўніверсітэце будзе праходзіць традыцыйны «Тыдзень донара». Неабходна, каб кожны студэнт і супрацоўнік лічылі сваім патрыятычным і маральным абавязкам удзел у бясплатным донарстве.

Быць донарам — пачэсна і высакародна!

**А. ПАВУК,**
**старшыня камітэта пярвічнай арганізацыі таварыства Чырвонага Крыжа ўніверсітэта, дацэнт.**

*Спорт*

**ПА ПРАГРАМЕ VIII УНІВЕРСІЯДЫ**

## ШАХМАТЫСТЫ МЕХМАТА — МАЦНЕЙШЫЯ

Пяць дзён за шахматнымі дошкамі вялася напружаная барацьба за права называцца лепшай шахматнай камандай універсітэта. У турнірнай табліцы каманда мехмата набрала 19,5 ачка і ўпэўнена заваявала першынство. У пераможцаў на першай дошцы вызначыўся кандыдат у майстры спорту Я. Акерман, які выйграў усе пяць партый.

Другім прызёрам універсіяды з 17,5 ачкамі стала каманда эканамічнага факультэта, трэцім з 13,5 ачкамі — фізічнага факультэта.

Наступныя месцы размеркаваліся такім чынам: геалагічны факультэт — 12 ачкоў, гісторыка-філалагічны — 7,5, факультэт фізічнага выхавання — 5 ачкоў. Каманда біялагічнага факультэта пацярпела ў першым туры паражэнне з сухім лікам і на наступную сустрэчу не з'явілася, за што была знята са спаборніцтваў і атрымае штрафныя ачкі. Думаецца, такі ўчынак шахматыстаў біяфаку не робіць ім гонару.

## РАЗВІТАННЕ З ЛЫЖНЁЙ

Камандныя спаборніцтвы студэнтаў-лыжнікаў універсітэта з'явіліся іх развітаннем з зімовым сезонам. На старт выйшла 129 чалавек. У жанчын на трохкіламетровай дыстанцыі перамагла Валянціна Манчанка з факультэта фізічнага выхавання. Яе сяброўка па камандзе Тамара Місько паказала другі вынік, а трэцім прызёрам стала Кацярына Літвіноўская з фізічнага факультэта.

Мужчыны спаборнічалі на дзесяцікіламетровай дыстанцыі. З лепшым вынікам закончыў яе Алег Афонька з факультэта фізвыхавання. Яго таварыш па вучобе Валерый Яскевіч быў трэцім, а другім прызёрам аказаўся Міхаіл Запольскі з эканамічнага факультэта.

У камандным заліку факультэты занялі наступныя месцы: 1. Факультэт фізвыхавання — 255 ачкоў. 2. Фізічны — 225. 3. Эканамічны — 218. 4—5. — механіка-матэматычны і гісторыка-філалагічны— па 131. 6. Геалагічны — 124. 7. Біялагічны факультэт — 93 ачкі.

## ПЕРАМАГЛІ ЛЫЖНІКІ «БУРАВЕСНІКА»

На працягу двух дзён у маляўнічай ваколіцы Гомеля праходзіла маладзёжнае першынство вобласці па лыжнаму спорту. Яго аспрэчвалі каманды шасці таварыстваў. Пераможцамі сталі лыжнікі ДССТ «Буравеснік», пад сцягам якога выступалі студэнты ГДУ. На другім месцы — каманда дынамаўцаў, на трэцім —спартакаўцаў.

У групе юніёраў 15-кіламетровую дыстанцыю хутчэй за ўсіх закончыў адзін з мацнейшых маладых лыжнікаў рэспублікі А. Афонька з ГДУ.

Студэнты былі мацнейшымі ў эстафетных гонках 3×10 км для юніёраў і 3×3 км для дзяўчат.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

АЗ 00103.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш.
Наш адрас: вул. Кірава, 119, корпус № 2, П 4-8, т. 6-75-10. Фармат 600×420 мм. Тыраж 2000 экз.

Заказ 1500